*А. М. Палуян, З. У. Шведава*
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

# ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ ПРАЗ УЗАЕМАДЗЕЯННЕ ШКОЛА – КАЛЕДЖ – УНІВЕРСІТЭТ – МУЗЕЙ – БІБЛІЯТЭКА

Папулярызацыя беларускай мовы і літаратуры на філалагічным факультэце ўстановы адукацыі “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны” адбываецца рознымі шляхамі і ў розных кірунках. У першую чаргу, праз цеснае супрацоўніцтва са школамі, гімназіямі, ліцэямі і педагагічнымі каледжамі г. Гомеля і Гомельскай вобласці.

У прыватнасці, выкладчыкі кафедры беларускай мовы В. А. Ляшчынская, прафесар, доктар філалагічных навук, і З. У. Шведава, дацэнт, кандыдат філалагічных навук, займаюцца арганізацыяй навукова- даследчай і эксперыментальнай дзейнасці ва ўстановах сярэдняй адукацыі.

На базе ДУА “Гімназія № 10 г. Гомеля” імі рэалізаваны праект “Лінгваэтнакультуралагічны кампанент навучання беларускай мове і выхавання моўнай асобы грамадзяніна Рэспублікі Беларусь”, які накіраваны на вырашэнне дзвюх асноўных праблем:

– распрацоўка сістэмы работы па выкарыстанні лінгваэтнакультуралагічных матэрыялаў на ўроках беларускай мовы і ў пазаўрочнай рабоце настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры;

– развіццё ў школьнікаў цікавасці да вывучэння жыцця, гісторыі беларускага народа, да даследчай работы па пытаннях сучаснай беларускай літаратурнай мовы, яе гісторыі і месца ў грамадстве, сярод іншых моў, параўнання культуры народаў і спосабаў яе адлюстравання і захавання ў мове.

На базе ДУА «Сярэдняя школа № 66 г. Гомеля» ажыццяўляўся праект “Развіццё пазнавальнай актыўнасці вучняў да вывучэння беларускай мовы і літаратуры праз арганізацыю навукова-даследчай работы”, рэалізацыя якога забяспечыла:

– знаёмства навучэнцаў з асновамі працы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

навукова-даследчага характару;

– садзейнічанне пашырэнню інфармацыйнай прасторы навучэнцаў, самасцвярджэння іх у калектыве юных навукоўцаў-беларусаведаў;

– стварэнне ўмоў для развіцця творчых і інтэлектуальных здольнасцей навучэнцаў;

– магчымасць прадстаўлення навукова-даследчых работ на розных узроўнях.

Даследчыя праекты найбольш адораных вучняў былі прадстаўлены на факультэце. У прыватнасці, для студэнтаў і выкладчыкаў было арганізавана выступленне вучаніцы ДУА "СШ № 19 г. Гомеля" Казлоўскай Лаліты і настаўніцы беларускай мовы і літаратуры Г.У. Канцавой з праектам "Наша спадчына – беларуская батлейка". Двойчы свае квэст-праекты і віктарыны, прысвечаныя жыццю і дзейнасці вядомага беларускага асветніка Францыска Скарыны, паказвалі вучні ДУА "Гімназія №10 г. Гомеля" пад кіраўніцтвам настаўніка беларускай мовы і літаратуры С. У. Несцяровіча. З адоранымі вучнямі нашы выкладчыкі займаюцца на базе ДУА «Гімназія №71 г. Гомеля» (Кастрыца А.А., к.ф.н., дацэнт), ДУА «Гімназія №36 г. Гомеля» (Паплаўная Л.В., к.ф.н., дацэнт), ДУА «Гімназія №56 імя А.А. Вішнеўскага» (Дакукін А.Д., магістрант), ДУА "Рэчыцкі раённы ліцэй" (Мінакова Л.М., к.ф.н., дацэнт).

На філалагічным факультэце паспяхова арганізавана работа школ юных: «Юны моваведа» і «Юны літаратар» (Кастрыца А.А., к.ф.н., дацэнт, Паплаўная Л.В., к.ф.н., дацэнт, Аммон М.У., к.ф.н., дацэнт). Выкладчыкі праводзяць дыстанцыйныя заняткі з вучнямі Гомельскай вобласці па падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання па беларускай мове, здачы ўступных іспытаў па беларускай літаратуры, кансультуюць па напісанні водгуку, вусным выказванні, выкананні лінгвістычных алімпіядных заданняў.

Супрацоўніцтва з установамі сярэдняй адукацыі і Гомельскім абласным інстытутам развіцця адукацыі рэалізуецца праз

– удзел выкладчыкаў факультэта ў якасці

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

членаў журы на абласных канферэнцыях даследчых работ школьнікаў «Пошук»,
«Свабодны выбар», «Мележаўскія чытанні»;

– навуковае суправаджэнне работ школьнікаў пры падрыхтоўцы да рэспубліканскага конкурсу даследчых работ;

– удзел выкладчыкаў ў працы журы на абласным і рэспубліканскім этапах алімпіяды па беларускай мове і літаратуры;

– падрыхтоўку вучняў да ўдзелу ў заключным туры рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры;

– удзел выкладчыкаў у працы журы абласнога конкурсу рытарычнага майстэрства «Гавары са мной па-беларуску».

Філалагічны факультэт цесна супрацоўнічае з педагагічнымі каледжамі Гомеля і Гомельскай вобласці. У прыватнасці, выкладчыкі нашага факультэта з'яўляюцца старшынямі Дзяржаўных атэстацыйных камісій у Лоеўскім педагагічным каледжы і Гомельскім педагагічным каледжы імя Л.С. Выгоцкага, прымаюць актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні навукова-практычных канферэнцый, арганізуюць прафарыентацыйныя сустрэчы для патэнцыяльных абітурыентаў.

Папулярызацыя беларускай мовы і літаратуры студэнтамі і выкладчыкамі філалагічнага факультэта рэалізуецца праз актыўны ўдзел у абласных і рэспубліканскіх тэлеперадачах. Гледачам запомнілася інтэрв'ю загадчыка кафедры беларускай літаратуры, прафесара, доктара філалагічных навук, лаўрэата Нацыянальнай літаратурнай прэміі ў намінацыі “Лепшы твор літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства” І.Ф. Штэйнера ў праграме Навума Гальпяровіча «Суразмоўцы», а таксам перадача «Галоўная тэма», прысвечаная асобе Ф. Скарыны, з удзелам І. Штэйнера і студэнтаў філалагічнага факультэта; цікавыя выступленні ў перадачы Алены Трацэнка «Дыяблог» прафесара, доктара філалагічных навук В. С. Новак і дацэнта, кандыдата філалагічных навук А. А. Кастрыцы, прысвечаныя традыцыйнай беларускай культуры. Сваімі поглядамі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

на гісторыю і сучасны стан беларускага мовазнаўства дзяліліся з тэлегледачамі ў перадачы «Добры вечар, Гомель» В. А. Ляшчынская, прафесар, доктар філалагічных навук, А. А. Станкевіч, прафесар, доктар філалагічных навук, Д. Д. Паўлавец, дацэнт, кандыдат філалагічных навук.

Яшчэ адзін напрамак нашай работы па папулярызацыі беларускай мовы і літаратуры – супрацоўніцтва з музеямі Гомеля і вобласці. Выкладчыкі беларускай мовы (прафесійнай лексікі) і гісторыі і тэорыі культуры пастаянна арганізуюць экскурсіі для студэнтаў усіх факультэтаў у Веткаўскі музей старaабраднiцтва і беларускіх традыцый імя Ф. Р. Шклярава і яго філіял у Гомелі. Акрамя таго, супрацоўнікі музея праводзяць лекцыі па традыцыйнай беларускай культуры, гісторыі народнага касцюма непасрэдна ў аўдыторыях універсітэта. Выкладчыкі кафедры беларускай літаратуры праводзяць заняткі на базе Літаратурнага музея і Музея рэдкай кнігі Гомельскай абласной бібліятэкі. Непасрэдна на нашым факультэце адкрыты літаратурны музей «Alma mater», прысвечаны творчасці літаратараў, журналістаў і бардаў – выпускнікоў нашага ўніверсітэта.

Пастаянна праводзяцца сустрэчы з вядомымі літаратарамі і музыкантамі, у тым ліку і выпускнікамі нашага факультэта – А. Мельнікавым, Э. Акулiным, А. Казловым, прафесарам Лонданскага ўніверсітэта, аўтарам грунтоўных манаграфій па беларускай літаратуры Арнольдам Макмілінам; паэтам, перакладчыкам, даследчыкам шматмоўнай даўняй беларускай літаратуры, выкладчыкам беларускай літаратуры Люблінскага ўніверсітэта імя Марыі Кюры-Складоўскай (Польша) Наталляй Русецкай, вядомым беларускім крытыкам, начальнікам упраўлення навукова-метадычнага суправаджэння адукацыйнага працэсу навукова-метадычнай установы “Нацыянальны інстытут адукацыі” Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Ірынай Шаўляковай, намеснікам галоўнага рэдактара часопіса “Маладосць” Дзмітрыем Шулюком, рэдактарам аддзела паэзіі Крысцінай Бандурынай, паэткай і арганізатарам паэтычных фестываляў Дашай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Бялькевіч, паэткай і перакладчыцай Ганнай Комар і інш.

На базе факультэта, абласной бібліятэкі і бібліятэкі імя Герцэна
праводзяцца прэзентацыі кніг вядомых паэтаў, празаікаў, крытыкаў: прэзентацыя кнігі Івана Штэйнера "Смехъ зъ болѣстию с смехавыя традыцыі Рэнесансу ў сатырычнай літаратуры XX стагоддзя"; сустрэча з вядомым тэатразнаўцам, доктарам філалагічных навук, дацэнтам Варшаўскага ўніверсітэта Андрэем Масквіным і прэзентацыя яго манаграфіі "Беларускі тэатр 1920-30-х гадоў", прэзентацыя кнігі перастварэнняў прадмоў і пасляслоўяў вялікага першадрукара "Францыск Скарына. Маем найбольшае самі" Алеся Разанава.

Усё пералічанае спрыяе выхаванню грамадзянска-патрыятычнай свядомасці, любві да сваёй радзімы, павагі да яе культурнай і гістарычнай спадчыны, стварае ўмовы для рэалізацыі творчага патэнцыялу моладзі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ